# ПРАДМОВА

Арганізаваная калектывам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта БДУ міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Усходняя Еўропа ў жалезным веку – эпоху Вялікага перасялення народаў» прысвечана памяці выбітнага навукоўца, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Андрэевіча Егарэйчанкі (23.04.1955 – 02.12.2021). Аляксандр Андрэевіч з'яўляўся адным з першых выпускнікоў кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, якая адчынілася ў БДУ ў 1973 г. Большая частка працоўнага шляху таленавітага даследчыка і патрабавальнага выкладчыка была звязаная з гістарычным факультэтам і кафедрай.

Цэнтрам навуковай дзейнасці А. А. Егарэйчанкі было вывучэнне старажытнасцей жалезнага веку. У 1982 г. ён пад навуковым кіраўніцтвам В. В. Сядова абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную старажытным умацаваным паселішчам насельніцтва Беларускага Палесся ў VII–VI ст. да н. э. – II ст. н. э. У 1980 г. Аляксандр Андрэевіч пачаў працаваць у Інстытуце гісторыі АН БССР. Ён праводзіў археалагічныя разведкі па Прыпяці і яе прытоках, ажыццяўляў стацыянарнае вывучэнне гарадзішча Івань, гарадзішча Кашчэлічы Валожынскага раёна, селішчаў Востраў Пінскага раёна і Давыд-Гарадок Столінскага раёна.

У 1988 г. аўтарытэтны даследчык быў запрошаны ў БДУ на пасаду дацэнта кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 1997 г. А. А. Егарэйчанка быў прызначаны выконваючым абавязкі, а ў 1998 г. – загадчыкам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. У 2001 г. кафедра была рэарганізавана, і Аляксандр Андрэевіч узначаліў абноўленую кафедру археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

За час працы ў БДУ А. А. Егарэйчанка плённа сумяшчаў працу выкладчыка і буйныя палявыя археалагічныя даследаванні. У 1988 г. навуковец ажыццявіў раскопкі на гарадзішчы каля в. Гарадзішча ў Мядзельскім раёне, затым на працягу трох сезонаў вёў працы на гарадзішчы Івань у Слуцкім раёне. У 1992 г. А. А. Егарэйчанка прыступіў да вывучэння помнікаў позняга бронзавага і жалезнага веку ў Браслаўскім раёне Віцебскай вобласці. З яго імем звязаныя раскопкі гарадзішча Тарылава, гарадзішча і селішча ў Зазонах і Рацюнках. Апошнія экспедыцыі пад кіраўніцтвам А. А. Егарэйчанкі праходзілі на паселішчы Падварынка з 2009 па 2013 гг.

У 2008 г. вынікам шматгадовай плённай працы даследчыка стала абарона доктарскай дысертацыі, у якой абгрунтоўвалася мэтазгоднасць падзелу культуры штрыхаванай керамікі на дзве самастойныя адзінкі і прапаноўваўся новы падыход да рэканструкцыі культурна-гістарычных працэсаў, што адбываліся ў паўночна-заходняй частцы лясной зоны Усходняй Еўропы ў канцы

II тыс. да н. э. – V ст. н. э. У 2013 г. яму было прысвоена званне прафесара. Велізарныя калекцыі матэрыялаў, назапашаныя Аляксандрам Андрэевічам, яго кнігі і рукапісы будуць запатрабаваныя наступнымі пакаленнямі даследчыкаў. А ў сэрцах вучняў А. А. Егарэйчанкі назаўжды застанецца добрая памяць аб настаўніку.

Нядзіўна, што канферэнцыя, прысвечаная памяці выбітнага даследчыка, атрымала актыўны водгук ад спецыялістаў ў галіне археалогіі жалезнага веку і эпохі Вялікага перасялення народаў з Беларусі і Расіі. Было прачытана 34 даклады, аўтарамі якіх сталі 43 навукоўцы з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Інстытута археалогіі РАН, Дзяржаўнага гістарычнага музея, Дзяржаўнага музея-запаведніка «Кулікова поле» і інш.

Пленарныя даклады былі прысвечаныя актуальным пытанням захавання археалагічнай спадчыны, вывучэнню матэрыяльнай культуры паселішчаў і пахавальнага абраду жалезнага веку – эпохі Вялікага перасялення народаў. Наступная праца канферэнцыі была арганізаваная па тэматычных секцыях, дзе разглядаліся сучасныя накірункі ў археалогіі жалезнага веку, навуковая спадчына А. А. Егарэйчанкі, пачатак жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі, гаспадарка і рэчавы інвентар жалезнага веку на тэрыторыі Усходняй Еўропы, вывучэнне археалагічных помнікаў жалезнага веку – эпохі Вялікага перасялення народаў на тэрыторыі Усходняй Еўропы. Таксама ўдзельнікі азнаёміліся з экспазіцыяй вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ.

Праца канферэнцыі паказала, што навуковая спадчына Аляксандра Андрэевіча Егарэйчанкі запатрабаваная сучаснай археалагічнай супольнасцю. Былі ўведзеныя ў навуковы зварот новыя матэрыялы, атрыманыя як у выніку палявых даследаванняў, так і ў ходзе архіўных пошукаў. Агучаны дыскусійныя пытанні, якія патрабуюць далейшага грунтоўнага вывучэння.

**А. Г. Каханоўскі**
*дэкан гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,*
*доктар гістарычных навук, прафесар*

**П. С. Курловіч**
*загадчык кафедры археалогіі і*
*спецыяльных гістарычных дысцыплін,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*